здольнасцей студэнтаў, што дазволіла ёй рабіць прагнозы, у большасці беспамылковыя, і знаходзіць той неабходны індывідуальны падыход, які дазваляе выканаўцу ператварыцца ў прафесійнага спевака.

Літаратура

1. *Берлянчик М. М.* Основы учения юного скрипача: Мышление. Технология. Творчество : монография. М., 1993.
2. Психология музыкальной деятельности: Теория и практика : учеб. пособие для студ. муз. фак. высш. пед. учеб. заведений / Д. К. Кирнарская [и др.]; под ред. Г. М. Цыпина. М., 2003.
3. *Яковлева А. С.* Вокальная школа Московской консерватории: Первое пятидесятилетие; 1866–1916. М., 1999.

Summary

Basic aspects of the vocal-pedagogical method of Professor T. N. Nizhnikova, where one of the key issues is understanding of practical work with the voice as a source of knowledge, are considered in the article. Her process of training of a performing musician can be regarded as an analytical work, aimed at disclosure of individuality of each pupil.

УДК 37(091)

М. І. Дземідовіч

ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ ВНУ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 50 – ПАЧАТКУ 60-Х ГГ. XX СТ.

У сучасных умовах правядзення рэформы вышэйшай адукацыі актуалізуюцца пытанні не толькі тэарэтычнай, але і практычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да прафесійнай дзейнасці.

Педагагічная практыка заўсёды разглядалася як найважнейшы кампанент практычнай падрыхтоўкі студэнтаў. У канцы 50-х гг. XX ст. у БССР сістэма падрыхтоўкі настаўнікаў паступова пераходзіць на новы ўзровень, з'яўляюцца новыя патрабаванні да сістэмы адукацыі. Для ажыццяўлення новай ідэі політэхнічнай адукацыі патрабавалася шмат добраадукаваных настаўнікаў. На новы ўзровень уздымаецца і педагагічная практыка.

У гэты час студэнты педагагічных інстытутаў праходзілі педагагічную практыку пачынаючы з чацвёртага курса, якая была з адрывам ад вучэбных заняткаў. Для практыкі навучальнымі ўстановамі падбіраліся як сельскія, так і гарадскія школы, дзіцячыя дамы, з імі заключаўся дагавор на пяць год. Працягвалася практыка шэсць тыдняў, практыканты працавалі ў школах шэсць гадзін у дзень. Першы тыдзень адводзіўся для назірання за дзейнасцю навучальнай установы, знаёмства з выхаваўчай і вучэбнай работай. У канцы тыдня студэнты складалі індывідуальны план работы, які зацвярджаўся навуковым кіраўніком. Згодна праграмных патрабаванняў, на працягу наступных пяці тыдняў практыкі студэнты павінны былі правесці 5–6 заліковых урокаў і 5–6 пробных. Акрамя гэтага, абавязковым было: прысутнасць на 20–25 уроках аднакурснікаў, дапамога класным кіраўнікам і піянерважатым, складанне плана і выканання выхаваўчых задач, прысутнасць на пазакласных мерапрыемствах, складанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі класа.

Да канца 50-х гг. XX ст. праграма практыкі для студэнтаў педагагічных ВНУ заставалася нязменнай. Аднак, як сведчыць аналіз архіўных крыніц, сістэма педагагічнай практыкі студэнтаў не забяспечвала выпрацоўкі ў студэнтаў дастатковых для работы ў школе практычных уменняў і навыкаў. Фактычна ігнараваліся патрабаванні закона «Аб умацаванні шолы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР», які быў прыняты восенню 1958 г. Адмоўнымі момантамі былі: лішняе апякунства студэнтаў з боку выкладчыкаў і настаўнікаў школ, якое перашкаджала набыццю навыкаў самастойнай работы; час педпрактыкі не заўсёды выкарыстоўваўся эфектыўна; уся практыка абмяжоўвалася толькі правядзеннем асобных заліковых урокаў і пазакласных мерапрыемстваў; заліковыя ўрокі рыхтаваліся студэнтамі ў іншых умовах, чым працаваў настаўнік. Часта сустракалася нізкая метадычная падрыхтоўка студэнтаў.

Змены ў арганізацыі і правядзенні педагагічнай практыкі намячаюцца восенню 1958 г., калі Міністэрстава асветы РСФСР выдае рэкамендацыі дырэктарам педагагічных інстытутаў, у якіх звяртае ўвагу на неабходнасць унясення прапаноў аб змяненні ў вучэбныя планы і праграмы інстытутаў. У прыватнасці, прапанавалася на II–III курсах інстытутаў увесці педагагічную практыку без адрыву ад заняткаў і дадатковых педагагічных курсаў для падрыхтоўкі студэнтаў да практыкі. [1, с. 59]. Разгле-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

дзім, як ажыццяўляліся новаўвядзенні на прыкладзе Брэсцкага педінстытута.

На першым курсе практыканты працавалі з акцябратамі, вучыліся складаць характарыстыку малодшых школьнікаў. Прысутнічалі на 6–8 уроках у школе. На другім курсе студэнты выконвалі ролю выхавальніка ў школе ці дзіцячых дамах, працавалі важатымі ў піянерскіх лагерах. Частка студэнтаў трэцяга курса практыкаваліся ў ролі важатага піянерлагераў, частка – у ролі важатых у групах акцябрат, астатнія – у ролі класных кіраўнікоў. На чацвёртых і пятых курсах педагагічная практыка была з адрывам ад вучэбных заняткаў, студэнты працавалі ў ролі настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка [2; с. 85].

Аднак меры па ўдакладненні працэсу правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў насілі толькі рэкамендацыйны характар і не былі абавязковымі для ўсіх інстытутаў. Гэта адмоўна адбівалася на ўсім вучэбна- выхаваўчым працэссе. Патрэбна было мяняць нарматыўна-прававое і метадычнае забеспячэнне практыкі студэнтаў, выпрацаваць абавязкі настаўнікаў школ, выкладчыкаў педагагічных навучальных устаноў, студэнтаў на перыяд практыкі. У Беларусі пачатак гэтаму працэсу быў пакладзены загадам № 698/169 па Міністэрстве вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР і Міністэрстве асветы БССР «Аб арганізацыі педагагічнай практыкі студэнтаў і мерах па паляпшэнні практычнай падрыхтоўкі студэнтаў для работы ў школе» і дадаткам да гэтага загаду «Інструкцыя па педагагічнай практыцы студэнтаў педагагічных інстытутаў». Прынятыя восенню 1960 г., гэтыя нарматыўныя акты значна змянілі сістэму арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў. Зменам падвергліся тэрміны, змест, формы справаздачы і кіраўніцтва практыкай.

Педпрактыка студэнтаў стала праводзіцца на працягу ўсіх гадоў навучання, пачынаючы з другога паўгоддзя першага курса, пры гэтым на першых – трэціх курсах яна была без адрыву ад вучэбных заняткаў. На чацвёртым курсе педпрактыка называлася абучаючай, а на пятым – стажорскай.

Кіраўніцтвам студэнтамі I–III і V курсаў займаліся спецыялісты школ, а адказнасць за педагагічную практыку студэнтаў IV курса нёс педінстытут.

Непасрэдна перад практыкай інстытуты арганізоўвалі факультатывы, практыкумы, семінары для студэнтаў I–III курсаў з мэтай узбагаціць іх навыкамі практычнай работы з дзецьмі. Кожны студэнт павінен быў праслухаць не менш трох дадатковых факультатыўных курсаў.

У выпадку дэфіцыту сярэдніх школ для практыкі студэнтаў маглі выкарыстоўвацца іншыя навучальныя ўстановы: дзіцячыя дамы, станцыі юных натуралістаў і г. д.

Канкрэтна разгледзім тэрміны і змест педагагічнай практыкі студэнтаў педінстытутаў. Практыка студэнтаў першага курса пачыналася з другога семестра пасля таго, як яны праходзілі інструктаж і факультатыўную падрыхтоўку відамі дзіцячай самадзейнасці: гурткамі «ўмелыя рукі», развучванне песень, таксама чыталіся факультатыўныя курсы: «Задача савецкай школы ў святле рашэнняў XXI з'езда КПСС і Закона «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы адукацыі СССР», «Узроставыя асаблівасці малодшых школьнікаў», «Педагагічны такт», «Методыка планавання работы ў пачатковай школе».

Педагагічная практыка студэнтаў II курса праходзіла на працягу трох семестраў. Час, які адводзіўся на педагагічную практыку без адрыву ад вучэбных заняткаў – 300 гадзін. Студэнты падзяліліся па 1–2 чалавекі на клас, дапамагалі настаўнікам ці з'яўляліся важатымі ў III–IV классах.

На III курсе практыканты працавалі ўжо ў V–VIII класах. Новаўвядзеннем была і летняя педагагічная практыка (4–8 тыдняў), якую студэнты праходзілі ў якасці важатых у піянерскіх лагерах, вучэбна-доследных гаспадарках, камсамольскіх атрадах. На летнюю практыку яны накіроўваліся па пісьмовым патрабаванні абласнога аддзела народнай адукацыі. Да практыкі дапускаліся студэнты, якія прынялі ўдзел у рабоце семінара па піянерскай дзейнасці і прайшлі практыку ў школе па пазакласнай рабоце. Практыка аплачвалася. Падрыхтоўкай, правядзеннем і кіраўніцтвам летняй практыкі займалася кафедра педагогікі.

Педагагічная практыка студэнтаў IV–V курсаў з адрывам ад вучобы праходзіла галоўным чынам у сямігодках і сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных установах. Там студэнты замацоўваліся за настаўнікам па 1–2 чалавекі. Кожны студэнт павінен быў адпрацаваць у школах не менш шасці гадзін у дзень. Першы тыдзень адводзіўся для знаёмства са школай, настаўнікамі, вучнямі. Практыканты, сумесна з настаўнікамі і класным кіраўніком, складалі індывідуальны план работы, які павінен быў быць зацверджаны для студэнтаў IV курса групавым метадыстам, для V курса – дырэктарам школы. Працягласць практыкі на IV курсе была 8 тыдняў. За гэты час практыканты праводзілі не менш чым 15 пробных урокаў, на якіх прысутнічалі настаўнік і метадыст, праводзіўся аналіз кожнага ўрока. Акрамя гэтага, студэнты займаліся вучэбна-выхаваўчай работай: аказвалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

розную дапамогу вучням, кіравалі прадметным гуртком, знаёміліся з абсталяваннем кабінетаў, праводзілі экскурсіі з вучнямі. Метадычная падтрымка студэнтаў IV курса праводзілася кафедрамі спецыяльных дысцыплін ці кафедрамі спецыяльных методык інстытутаў, якія для гэтай мэты выдзялялі метадыстаў, кожны з якіх кансультаваў па 12–13 студэнтаў [3, с. 45].

Педагагічная практыка студэнтаў V курса (стажорская практыка) працягвалася 12 тыдняў і праводзілася галоўным чынам у школах сельскай мясцовасці. Першы тыдзень практыкі, як і на IV курсе, адводзіўся для знаёмства са школай, класам, планавання выхаваўчай работы з вучнямі. Наступныя 2 тыдні студэнты праводзілі пробныя ўрокі па спецыяльнасці, астатнія 9 тыдняў поўнасцю займаліся настаўніцкай дзейнасцю, аднак забаранялася праводзіць больш за 12 урокаў у тыдзень.

Адначасова з практыкай студэнты IV–V курсаў праводзілі агітацыйную работу сярод дарослага насельніцтва, афармлялі чырвоныя куточкі, а выкладчыкі кафедр педагогікі праводзілі выязныя пасяджэнні кафедр, на якіх рашалі на месцах праблемы педагагічнай практыкі, арганізоўвалі бацькоўскія універсітэты.

У кожным педагагічным інстытуце ўводзілася пасада кіраўніка практыкі, які забяспечваў арганізацыю педагагічнай практыкі. Ён падбіраў навучальныя ўстановы, афармляў з імі дагаворы, складаў гадавую справаздачу па практыцы, ставіў адзнаку студэнтам па выніках праверкі дакументацыі педпрактыкі і работы з дзецьмі.

Звычайна адказным за педагагічную практыку на факультэце з'яўляўся дэкан. У той навучальнай установе, дзе практыку праходзіла больш за 200 чалавек, на дапамогу дэкану назначаўся выкладчык (кіраўнік педагагічнай практыкі).

У канцы педагагічнай практыкі студэнты ўсіх курсаў здавалі на праверку дзённік практыкі, у якім знаходзіліся звесткі з назіранняў за ўрокамі, пазакласнымі мерапрыемствамі. Акрамя гэтага, студэнты I–III курсаў павінны былі здаць на кафедру педагогікі справаздачу і асабістую характарыстыку, падпісаную настаўнікам школ, начальнікамі піянерлагераў. Студэнты IV–V курсаў прадстаўлялі інстытуту справаздачу па педагагічнай практыцы, да якой дадаваліся план практыкі, дзённік, канспекты асобных урокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў. У канцы стажорскай практыкі педагагічны савет школы адзначаў работу кожнага студэнта.

Павелічэнне гадзін педагагічнай практыкі, змены зместу практыкі станоўча паўплывалі на падрыхтоўку студэнтаў для практычнай прафесійнай дзейнасці. Большасць студэнтаў паспяхова выканалі патрабаванні практыкі і атрымалі добрыя адзнакі. Вынікі педагагічнай практыкі студэнтаў некаторых ВНУ прыведзены у табл. 1–4.

Табліца 1

Вынікі педагагічнай практыкі студэнтаў IV–V курсаў БДУ імя Леніна за 1960/61 навучальны год [4, с. 181]

Факультэт	Усяго студ.	Адзнакі			
		Выд.	Добра	Здав.	Нездав.
Матэматычны	24	14	10	0	0
Філалагічны	90	53	34	2	1
Фізічны	67	36	30	1	0
Гістарычны	42	35	7	0	0
Геаграфічны	42	21	20	1	0
Хімічны	52	28	24	0	0
Біялагічны	48	57	11	0	0
Вынік	365	224 (61 %)	136 (37 %)	4 (1 %)	1 (0,3 %)

Табліца 2

Вынікі педагагічнай практыкі студэнтаў IV–V курсаў Віцебскага пединстытута за 1960/61 навучальны год [5, с. 66]

Факультэты	Выд.	Добра	Здав.	Усяго
Матэматыкі	18	48	2	68
Фізікі	21	36	11	68
Усяго па фізмаце	39	83	13	136
Хім-бія	31	15	0	46
Усяго па IV курсе	70	99	13	182

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 3

Адзнакі пазашкольнай работы студэнтаў Віцебскага педінстытута па спецыяльнасці [5, с. 66]

Факультэты	Выд.	Добра	Здав.	Усяго
Матэматыкі	18	48	2	68
Фізікі	21	36	11	68
Усяго па фізмаце	39	84	13	136
Хім-бія	31	15	0	46
Усяго па IV курсе	70	99	13	182
%	39 %	55 %	6 %	100 %

Табліца 4

Звод агульных адзнак па педпрактыцы студэнтаў V курса Віцебскага педінстытута [5, с. 66]

Факультэты	Выд.	Добра	Здав.	Усяго
Фізмат	61	75	7	143
Хім-бія	48	33	1	82
Усяго па V курсе	109	108	8	225
%	48.4 %	48 %	3.6 %	100 %

Намеціліся і некаторыя адмоўныя моманты ў арганізацыі і правядзенні педагагічнай практыкі гэтага перыяду: студэнты няўмела выкарыстоўвалі абсталяванне на ўроках, не ведалі вядомых твораў дзіцячай літаратуры, некаторыя з іх мелі праблемы ў час працы з класам, паказалі слабыя веды тэарэтычнага матэрыялу. Былі зафіксаваны таксама недахопы работы настаўнікаў школ у адносінах да студэнтаў: малая колькасць патрабаванняў, фармальнасць у кіраўніцтве студэнтамі.

З мэтай ліквідавання ўказаных недахопаў Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР і Міністэрства асветы БССР праводзіла мэтанакіраваную работу па ўдасканальванні зместу, патрабаванняў да студэнтаў, праграмнага забеспячэння педпрактыкі. У 1964 г. педынстытутам выпускаецца Інструкцыя па правядзенні педагагічнай практыкі. У адпаведнасці з ёй была распрацавана новая праграма педпрактыкі для студэнтаў педінстытутаў. У сувязі з палітычнай сітуацыяй у краіне шмат увагі стала ўдзяляцца прапагандысцкай рабоце са студэнтамі. Так, напярэдадні практыкі студэнтам чыталіся курсы: «XXII з'езд КПСС аб народнай адукацыі.», «Новае ў рабоце перадавых настаўнікаў па асобных спецыяльнасцях» і інш. Вучэбная частка інстытута і кафедры педагогікі сталі праводзіць сходы па зацвярджэнні адзіных патрабаванняў для студэнтаў на перыяд практыкі. Галоўным чынам змяніўся змест педагагічнай практыкі студэнтаў IV–V курсаў. Павялічылася і працягласць практыкі, яна стала складаць 8 тыдняў на IV і 12 тыдняў на V курсах. Нова-ўвядзеннем было і тое, што практыканты ў перыяд практыкі павінны былі весці прапагандысцкую работу сярод вучняў, іх бацькоў, насельніцтва. Перад практыкай праводзіўся трохдзённы семінар. Інстытуты ўзмацнілі ўвагу да інструктажу настаўнікаў па рабоце са студэнтамі. Згодна з інструкцыяй, для ўсіх інстытутаў прадугледжваліся наступныя патрабаванні да практыкі. На працягу першага тыдня студэнты знаёміліся са школай і класамі, наведвалі ўрокі ў замацаваным класе, распрацоўвалі індывідуальны план работы. На працягу ўсяго перыяду практыкі кожны павінен быў распрацаваць канспект і правесці не менш 12–14 урокаў розных тыпаў, з прымяненнем розных методык і выкарыстаннем розных форм работы, ствараць наглядныя дапаможнікі да ўрокаў, выконваць абавязкі класнага кіраўніка, падрыхтаваць і правесці ў замацаваным класе сход вучняў, адну-дзве палітінфармацыі, кіраваць прадметным гуртком, удзельнічаць у правядзенні і арганізацыі экскурсій, гутарак, тэматычных вечароў, аналізаваць урокі, працаваць з бацькамі вучняў, збіраць матэрыял для напісання курсавой работы [6, с. 45]. Патрабаванні інструкцыі шляхам мэтанакіраванай работы інстытутаў амаль поўнасцю былі ўведзены ў жыццё. Так, у Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна на IV курсе факультэта пачатковай адукацыі педпрактыка праходзіла ў два этапы: вучэбная практыка з 31 жніўня па 28 верасня і стажорская практыка з 8 лютага па 20 сакавіка. Усе студэнты падзяляліся па школах прыкладна па адным чалавеку на клас. Кожны праводзіў 12–15 урокаў. Стажорская практыка студэнтаў IV курса праходзіла ў большасці ў школах сельскай мясцовасці, кожны студэнт ствараў 3–4 наглядныя сродкі, праводзіў 5–7 экскурсій.

Стажорская практыка студэнтаў V курса працягвалася 12 тыдняў, яна праходзіла ў V–X класах сельскіх школ. Пасля знаёмства са школай і класам студэнты поўнасцю працавалі ў ролі настаўнікаў і класных кіраўнікоў.

Прайшлі некаторыя змены і ў падвядзенні вынікаў практыкі. Усё больш актуальным становіцца правядзенне замест традыцыйнай за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ключнай канферэнцыі розных выставак наглядных сродкаў студэнтаў і мерапрыемстваў па прысвячэнні практыкантаў у настаўнікі.

Дзякуючы шматлікім мерапрыемствам, якія праходзілі ў 1955–1965 гг. па ўдасканаленні праграмнага забеспячэння, арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі, яе тэрмінаў, былі дасягнуты значныя поспехі ў падрыхтоўцы студэнтаў да прафесійнай дзейнасці. Аднак на той момант яшчэ не ўдалося поўнасцю ліквідаваць усе адмоўныя кірункі педпрактыкі. Паранейшаму найбольш актуальнымі праблемамі з'яўляліся наступныя: кафедры педагогікі мала ўвагі ўдзялялі аналізу ўрокаў, складу дзённікаў, вядзенню назіранняў за вучнямі. Не ўсе метадысты кантралявалі студэнтаў, не ўсе студэнты маглі самастойна працаваць над дадатковай літаратурай, многія з іх не валодалі методыкай рашэння задач, уменнем слухаць адказы школьнікаў, не ўсе маглі рабіць вуснае апытанне, існавалі цяжкасці некаторых студэнтаў у арганізацыі пазнавальнай дзейнасці школьнікаў і выкарыстання на ўроку школьнай дошкі. У некаторых студэнтаў была недастаткова развіта культура мовы.

Бясспрэчным застаецца факт, што ў канцы 50 – сярэдзіне 60-х гг. XX ст. была праведзена мэтанакіраваная работа па арганізацыі і правядзенні педагагічнай практыкі студэнтаў, вызначаны дакладныя тэрміны, змест, формы справаздач. У гэты перыяд быў закладзены фундамент сучаснай педагагічнай практыкі.

Крыніцы

1. НА РБ, ф. 42, воп. 7, спр. 915, л. 59.
2. НА РБ, ф. 1220, воп. 1, спр. 51, л. 85.
3. НА РБ, ф. 1220, воп. 1, спр. 157, л. 45.
4. НА РБ, ф. 1220, воп. 1, спр. 152, л. 181.
5. НА РБ, ф. 1220, воп. 1, спр. 158 л. 66.
6. НА РБ, ф.1220, воп. 1, спр. 984, л. 45.

Summary

The given article touches upon the matters of organization and conducting of students' pedagogical practice in Belarus at the end of the 50s and middle 60s of the 20th century. Considering some archive files the author analyses the terms, the pedagogical practice program maintenance, the forms of students' reports. The peculiarities of practice conducting at different pedagogical Institutes, as well as the negative sides of the given process are revealed. The author comes to the very important conclusion that the foundation of present-day pedagogical practice was actually laid at this period.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ